1. Жлобинский историко-краеведческий музей, НВ 3354: Решение Краснобережского сельского совета депутатов № 6-1 от 12.11.2014 г.

2. Национальный архив Республики Беларусь: Ф. 861. Оп. 1. Ед. хр. 6. Л.153-153 об.

3. Национальный архив Республики Беларусь: Ф. 1450. Оп. 5. Д. 467. Л192-195.

4. *Шуканов, Н.* Благодарная память краснобережцев // Жлобинская районная газета «Новы дзень». – 23.01.2015 г., с. 4.

5. Сколько детей погибло в годы ВО войны [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://otvet.mail.ru/question/39315853. – Дата доступа: 18.02.2015.

6. Учреждение «Государственный архив Гомельской области»: Ф. 1345. Оп. 1. Ед. хр. 17. Л. 162.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АСЭНСАВАННЕ ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў СУЧАСНЫХ СПЕКТАКЛЯХ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁТЭАТРА

***У. А. Трапянок,***
*кандыдат мастацтвазнаўства,*
*дырэктар дырэкцыі канала «Культура»*
*Беларускага радыё Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі*
*Рэспублікі Беларусь*

Тэма Вялікай Айчыннай вайны, подзвігу народа, мужнасці і патрыятызму была і застаецца адной з ключавых у айчынным аўдыяльным вяшчанні і, у прыватнасці, у дзейнасці радыётэатра Беларусі. У розныя гады, пачынаючы з сярэдзіны мінулага стагоддзя, супрацоўнікі літаратурнай рэдакцыі Беларускага радыё стварылі дзясяткі радыёспектакляў, паэтычных кампазіцый, літаратурна-мастацкіх праграм па творах В. Быкава, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, І. Шамякіна, А. Дударава і іншых пісьменнікаў, якія пісалі пра подзвігі, няскоранасць, любоў народа да сваёй зямлі і спавядалі горкую праўду жудасных падзей. У гэтым матэрыяле асноўная ўвага надаецца радыёспектаклям як найвышэйшай прояве радыётворчасці.

У фондах Беларускага радыё захоўваюцца радыёверсіі спецыяльна адаптаваных для аўдыягучання тэатральных спектакляў, а таксама арыгінальныя радыётворы, у аснову якіх пакладзены п’есы ці інсцэніраваная літаратура. Напрыклад, у 1964 г. паводле паэмы М. Танка «Янук Сяліба» быў створаны аднайменны радыёспектакль. Кожны вобраз вылучаўся праўдзівасцю, шырынёй і паглыбленасцю ў матэрыял, ад чаго

радыётвор атрымаўся захапляльным. Мастацкае адлюстраванне ваеннай рэчаіснасці знайшло таксама ўвасабленне ў радыёпастаноўцы 1964 г. «Сасна пры дарозе» паводле аднайменнага рамана І. Навуменкі.

Запатрабаваным на радыё аўтарам, які асэнсоўваў падзеі Вялікай Айчыннай вайны з пазіцыі патрыёта-гуманіста, можна назваць В. Быкава. Найстарэйшая фондавая пастаноўка, што захоўваецца на Беларускім радыё з 1960 г., называецца «Сляды на зямлі», інсцэніроўку для якой зрабіў сам В. Быкаў. Майстэрства акцёраў А. Клімавай, В. Тарасава, С. Бірылы, Б. Уладамірскага и іншых, іх галасы, эмоцыі зафіксаваў радыёспектакль «Альпійская балада», пастаўлены рэжысёрам М. Троіцкай у 1964 г. Этапнымі работамі айчыннага радыётэатра паводле празаічных твораў В. Быкава сталі пастаноўкі рэжысёра С. Гурыч «Жураўліны крык» (1965 г.) і «Пайсці і не вярнуцца» (1979 г.). Крытыкі адзначалі цэласнасць, яркасць, напружанасць твораў, якія раскрываюць глыбіню псіхалагічных даследаванняў В. Быкава [1].

У фондах Беларускага радыё таксама захоўваюцца радыёспектаклі «Круты бераг ракі» ў рэжысуры М. Троіцкай (1973 г.), «Кар'ер» (1987 г.), «У тумане» (1989 г.), «Мёртвым не баліць» (1990 г.), якія паставіў В. Анісенка. Аповесць В. Быкава «Альпійская балада» і музыка Я. Глебава да аднайменнага балета знайшлі ўвасабленне ў радыёстудыях у выглядзе музычнага радыёспектакля 1981 г. «Альпійская балада».

Некаторыя сцэнічныя творы па творах В. Быкава перанесены ў аўдыяльную прастору радыётэатра. Сярод іх – спектаклі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы «Апошні шанц» і Нацыянальнага драматычнага тэатра імя М. Горкага «Знак бяды». Рэжысёрамі аўдыяработ 1976 г. і 1987 г. адпаведна выступілі С. Гурыч і В. Анісенка [2].

Літаратурная спадчына В. Быкава застаецца запатрабаванай і ў сучасны перыяд функцыянавання айчыннага радыётэатра. Запіс радыёспектакля «Пастка» ў 2009 г. стаў прысвячэннем Беларускага радыё 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Інсцэніроўка аднайменнай аповесці зроблена рэдактарам Г. Шаблінскай, пастаноўка ажыццёўлена рэжысёрам А. Вінярскім. Згодна з сюжэтам, малады лейтэнант Клімчанка апынаецца ў пастцы, калі трапляе ў палон да немцаў. Ворагі даруюць яму жыццё, але навешваюць на лейтэнанта ярмо «здрадніка» перад сваімі. Невінаваты камандзір вяртаецца ў сваю роту ў «новай» якасці. Галоўную ролю ў радыёспектаклі выканаў акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы А. Кавальчук [3].

Да 70-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 2014 г. на Беларускім радыё быў запісаны вобразны, узнёслы спектакль «Млечны шлях» паводле аднайменнага рамана К. Чорнага. Галоўнай тэмай пастаноўкі стала вайна вачыма еўрапейцаў, прадстаўнікоў не-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калькіх народаў, якія па-свойму ўспрымаюць жудасную падзею. Гэта героі-сімвалы, якіх аб'яднала жаданне жыць у міры. У творы быццам перасякаюцца розныя часавыя перыяды, тэматычныя пласты, чалавечыя ўчынкі, думкі, разважанні, дзеянні, якія прымушаюць слухача быць у пастаянным эмацыянальным напружанні. На чале творчага працэсу стаяў рэжысёр А. Вінярскі. Інсцэніроўшчык П. Васючэнка ўвёў у аўдыятвор новага персанажа – пісьменніка Кузьму Чорнага. Яркай работай у радыёспектаклі «Млечны шлях» стала акцёрскае выкананне А. Гарцуева. Яго роля Кузьмы Чорнага дадае глыбіннасці, разважлівасці аўдыятвору. Пісьменнік адначасова выступае ў вобразах філосафа, змучанага абставінамі, летуценніка, які глядзіць на неба, незалежнага назіральніка, стрыманага ў эмоцыях, ацэнках. Іншыя ролі выканалі акцёры Г. Аўсяннікаў, В. Манаеў, А. Памазан, М. Захарэвіч, М. Кірычэнка, А. Душачкін, У. Мішчанчук і інш.

Па словах аўтара ідэі пастаноўкі Г. Шаблінскай, праца над увасабленнем матэрыялу ішла нялёгка, аднак у літаратурных і тэатральных колах краіны радыёспектакль назвалі найлепшым за апошні час [3]. Унікальнасць гучанню твора дадало мінімальнае гукавое афармленне, створанае гукарэжысёрам В. Бяляевым, а таксама музыка, напісаная кампазітарам У. Саўчыкам і выкананая сімфанічным аркестрам Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам дырыжора Ю. Караваева. Твор даносіць да слухацкай аўдыторыі ідэі міру, еднасці, братэрства.

Яшчэ адным сучасным радыётворам на ваенную тэматыку з пераасэнсаваннем жудасных падзей з'яўляецца спектакль 2015 г. «…І няма шляху чужога» па аднайменнай аповесці У. Саламахі. Дзеянні ў аўдыяльным спектаклі разгортваюцца ў апошні год вайны. У цэнтры ўвагі – трагічны лёс Іосіфа Кучынскага са спаленай карнікамі вёскі Гуда, якому наканаваны шлях ізгоя, бо ён – бацька паліцая. Складаныя супярэчлівыя адносіны галоўнага героя з аднавяскоўцамі поўняцца надзеяй на разуменне і дараванне. Ідэя радыёспектакля заключаецца ў выснове, што чалавек у любых абставінах і сітуацыях, нават трагічных, павінен заставацца чалавекам. Ключавой з'яўляецца роля ад аўтара, які адначасова выступае апавядальнікам, каментатарам, суддзёй. Гэты шматгранны вобраз стварыў акцёр С. Журавель. На выкананне іншых роляў рэжысёрам А. Вінярскім былі запрошаны акцёры мінскіх тэатраў А. Памазан, Г. Аўсяннікаў, М. Кірычэнка, М. Захарэвіч, У. Мішчанчук, А. Сідарава і інш. У стварэнні масавых сцэн (на вакзале, на базары, раз'юшанага натоўпу) удзельнічалі артысты заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Акадэмічны хор Белтэлерадыёкампаніі». Музычна-кампілятыўнае суправаджэнне з твораў кампазітара Д. Смольскага ажыццёўлена сімфанічным аркестрам Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам дырыжора В. Сарокі. Прэм'ера радыёспектакля «…І няма шля-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ху чужога» была прымеркавана да 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне [3].

Радыёспектакль «Лісты, вернутыя з небыцця…», прэм’ера якога адбылася на дзяржаўным радыё ў 2016 г., стаў прысвячэннем 120-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі К. Крапівы. Малавядомыя масаваму слухачу, але вельмі трагічныя для айчыннага класіка факты з яго біяграфіі ляглі ў аснову гэтай пастаноўкі. У эфіры былі агучаны франтавыя лісты старэйшага сына К. Крапівы Барыса, які загінуў пад Сталінградам у 1942 г. Пры жыцці славутага байкапісца гэтыя дакументальныя матэрыялы не друкаваліся. Такім чынам у радыётворы спалучыліся дакументальнасць і мастацкія вартасці, увасобленыя ў творы рэдактарам Г. Шаблінскай, рэжысёрам А.Вінярскім, акцёрамі А. Памазанам, А. Шаровым, Г. Чарнабаевай, А. Сідаравай, А. Каралевічам, Л. Фалей, а таксама гукарэжысёрам В. Бяляевым.

Аповесць В. Быкава «Воўчая зграя», інсцэніраваная Г. Шаблінскай, пакладзена ў аснову аднайменнага радыёспектакля 2019 г. у пастаноўцы А. Вінярскага. Паводле слоў рэжысёра, гэта новае прачытанне класічнай для Беларусі літаратуры з улікам сучаснага разумення страшэннай трагедыі мінулага стагоддзя. Радыёспектакль «Воўчая зграя» вылучаецца эмацыянальнай напружанасцю, дасягненне якой стала магчымым, у т. л., дзякуючы ўдзелу ў пастаноўцы прафесійных акцёраў мінскіх тэатраў Г. Аўсяннікава, А. Гарцуева, А. Душачкіна, Л. Улашчанкі, А. Памазана, А. Кавальчука, І. Сідорчыка, С. Жбанкова, Д. Камінскай, Г. Гаранскага, А. Сянчылы. Багатае музычна-шумавое афармленне гукарэжысёра В. Бяляева паспрыяла стварэнню праўдзівай акустычнай атмасферы. Арыгінальную музыку да радыёспектакля напісаў кампазітар У. Саўчык, выканалі яе артысты сімфанічнага аркестра і акадэмічнага хору Белтэлерадыёкампаніі. Разам з тым праслухоўванне прэм’ернай трансляцыі пастаноўкі дазволіла зафіксаваць некаторыя недакладнасці. Сярод іх, напрыклад, можна назваць перанасычанасць ролі вядучага працяглым маналогам у пачатку, што стварыла адчуванне гучання твора ў жанры радыёсерыяла ці монадрамы, а не радыёп’есы, для якой найбольш характэрны дыялогі ці трыялогі. У некаторых сцэнах, калі на фразы герояў накладваліся словы вядучага, стваралася адчуванне гукавога нагрувашчвання, што замінала сэнсаваму разуменню. Час ад часу не вельмі дакладным было выкарыстанне музычнага матэрыялу, які выводзіўся на пярэдні план і гучаў да заканчэння музычнай тэмы, што запавольвала тэмпарытм твора, стварала ўражанне спецыяльнага расцягвання спектакля.

У выбраных сцэнах была дапушчана акцёрская няпраўда існавання ў прапанаваных абставінах. Напрыклад, паранены Ляўчук пасля бяссоннай ночы гаворыць бадзёрым, «чыстым» голасам, уласцівым чалавеку,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

які добра адпачыў. На нашу думку, таксама, не хапіла ў акцёрскім гучанні стрыманасці, адчування небяспекі ў сцэне размоў у дарозе ва ўмовах магчымасці натрапіць на фашыстаў. Аднак дастаткова працяглы па гучанні твор атрымаўся цэласным. Прэм'еру радыёспектакля «Воўчая зграя» прымеркавалі да 95-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі В. Быкава і 75-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Такім чынам, тэма вайны ў радыётэатры Беларусі застаецца актуальнай і запатрабаванай. У сучасных радыёспектаклях адбываецца пераасэнсаванне ваенных падзей, учынкаў асобных герояў і антыгерояў, спавядаюцца тэмы міру і яго важнасці ў жыцці чалавека, няскоранасці духу і слабасці ў пэўных абставінах, маштабнага патрыятызму і асабістай трагедыі. Асноўным драматургічным матэрыялам для сучасных аўдыяльных пастановак з'яўляюцца інсцэніроўкі вядомых літаратурных твораў. Высокі мастацкі ўзровень радыёспектакляў забяспечваюць вопытныя майстры радыёсправы, акцёры мінскіх тэатраў, прафесійныя кампазітары і музычныя калектывы Белтэлерадыёкампаніі.

1. *Соня Гурыч.* Жыццё ў беларускім мастацтве : зборнік / склад. М. Л. Іваноў. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2004. – 122 с.

2. *Трапянок, У. А.* Рэпрэзентацыя твораў В. Быкава на ваенную тэматыку ў тэлевізійным і радыётэатры Беларусі / У. А. Трапянок // Культура. Наука. Творчество : IX Междунар. науч.-практ. конф., редкол.: В. М. Черник (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2016. – С. 223–227.

3. *Трапянок, У. А.* Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок. – Мінск : БДУКМ, 2019. – 207 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНТЭРАКТЫЎНЫ МУЗЕЙНЫ ЗАНЯТАК «ВОДБЛІСК НАЙВЯЛІКШАЙ ПЕРАМОГІ»

***Н. В. Трафімчык,***
*вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь»*

***Н. М. Усава,***
*вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь»*

Сёлетні год адзначаны важным юбілеем – 75-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Нягледзячы на аддаленасць у часе падзей вайны, памяць пра іх беражліва захоўваецца і перадаецца з пакалення ў